# ЖЫЛО-БЫЛО ДРЭВА

МАЛЯЎНІЧАЯ СКАРБОНКА



# ЖЫЛО-БЫЛО ДРЭВА

*Кніжка-маляванка*



МАЛЯЎНІЧАЯ СКАРБОНКА

ЖЫЛО–БЫЛО ДРЭВА.
КАРАНЯМІ ТРЫМАЛАСЯ ЗА ЗЯМЛЮ.
ГАЙДАЛА ПТУШЫНЫЯ ГНЁЗДЫ, ШАПАЦЕЛА ЛІСТОТАЙ.
АДНОЙЧЫ БУРА ЗЛАМАЛА ДРЭВА.
АЛЕ ГЭТА НЕ КАНЕЦ, А ПАЧАТАК НОВАЙ ГІСТОРЫІ – ГІСТОРЫІ ПАВАЛЕНАГА ДРЭВА



Мінск
2002 г.

***Шаноўныя сябры!***

*Першае выданне кніжкі-маляванкі знайшло добры водгук у школах і дзіцячых садках. Уражаннямі ад працы з кніжкай падзяліліся педагогі горада Жыткавічы Гомельскай вобласці. Як вядома, на тэрыторыі гэтага рэгёна знаходзіцца адзін з самых адметных нацыянальных паркаў Беларусі – Прыпяцкі.*

Сёння маляванку для дзяцей знайсці нескладана. Але ўсе яны вельмі падобныя: альбо гэта вядомыя казкі, альбо «любімыя мульцікі». І большасць рускамоўныя. Кніжка «Жыло-было дрэва» прыемна адрозніваецца ад большасці, мае выразны прыродаэтычны змест, раскрывае шмат таямніц, на якія чалавек ці забываецца, ці не зважае. Матэрыял вобразны, запамінальны, выкладзены даступна. З маляванкай прыемна працаваць, кожная яе старонка вучыць дзяцей любіць усё роднае і бачыць прыгожае.

Выхавацелі сада-ясляў №5:
**Багдановіч В.А., Самайловіч М.Я.,**
**Ахоценка Ж.А., Асіпенка С.М. і інш.**

Вучні 2 «А» класа з захапленнем малявалі і паваленае дрэва, і жыхароў лесу.

Гісторыя пра тое, як дрэва становіцца сховам ды месцам адпачынку для меншых братоў-суседзяў, абуджае ў дзяцей фантазію і спачуванне жывым істотам.

Кніга вучыць разумець, берагчы і любіць прыроду, адчуваць яе каштоўнасці там, дзе чалавек іх прысвоіў як дадзенае менавіта яму. Аднак правільна паводзіцца ў прыродзе – значыць шмат змяніць у нашых звычках, асэнсаваць памылкі і не паўтараць іх. У гэтым акурат і здольная дапамагчы сціплая маляванка".

**Настаўніца СШ №3 Кошман А.І.**

Маленькі прыклад з паваленым дрэвам надзвычай цікавы і характэрны. З яго і варта пачынаць вялікую гаворку пра каштоўнасці Беларускага Палесся, «запасы» хараства нашых непаўторных дуброваў, лясоў і ўрочышчаў, поймавых краявідаў. Мяркуем, такая кніжка пажаданая ва ўсіх нацыянальных парках Беларусі, дзе жывёльны і раслінны свет трэба ахоўваць не толькі з дапамогай законаў, але і свядомасці людзей, якія там жывуць.

**Настаўнікі пачатковых класаў СШ №1.**

## Дарагі сябар!

Ты маеш кніжку-маляванку, якую зрабілі для цябе мастак і вучоны-эколаг. Прыгледзься да кожнай старонкі, перш чым брацца за фарбы. Нам хацелася б, каб ты навучыўся не толькі маляваць, але і разумець прыроду, шанаваць яе ўлонне.

Прырода - разнастайны і цесна звязаны свет. Яна ў цябе за акном, або недалёка ад твайго дому. Гэтак у кожнага чалавека, які жыве на планеце, – прырода вакол яго. Для малявання табе прыдадуцца каляровыя алоўкі або фламайстары. Можаш паспрабаваць акварэльныя фарбы. Распусці ў вадзе жаданы колер і зрабі спачатку лёгкую празрыстую падмалёўку: чым далей прадмет, тым слабейшая фарба...



*Дык, пачынай!*





САМАЕ ПРЫКМЕТНАЕ Ў ГЭТЫМ ВЯЛІКІМ І РАЗНАСТАЙНЫМ СВЕЦЕ, БАДАЙ, ДРЭВЫ. ЯНЫ НЕ КРАНАЮЦЦА З МЕСЦА І ЗАЎСЁДЫ НАВІДАВОКУ.

ТОЛЬКІ ЗДАЕЦЦА, ШТО ДРЭВА ПРОСТА СТАІЦЬ. У ЯГО БЕЗЛІЧ АБАВЯЗКАЎ! ЯК ДОБРЫ ЧАЛАВЕК – ЯНО ПАТРЭБНАЕ ЎСІМ.







Нават тады, калі дрэва ўпала,  ураган або яшчэ якое ліха, – яно застаецца патрэбным. Тут – у лесе, дубовым гаі ці ў зялёным прырэччы – зваленае дрэва не страчвае годнасць і хараство. Прырода па-ранейшаму трымае яго за неабходную частку свайго свету.



Рысь і яе кацяняты знайшліе месца, дзе ім добра.



Пры камлі ўпадабала сабе ляжанку казуля. Па-летняму ўтульна. Быццам пад хатай. Часам ціхі куточак наведваюць прытомленыя дзікі.



Кватэравацъ пад дрэвам збіраецца вожык. Калі да зімы недалёка, спаткаць такую схованку – адна радасць. У лісці ды ў сухім вецці ён будзе спаць ажно да вясны.



У ЛЕСЕ ПАСПЕЛІ ЖАЛУДЫ. ЦЯПЕР КЛОПАТ, КУДЫ ІХ ПАДЗЕЦЬ. СОЙКА ШУКАЛА ДУПЛО – І ЗНАЙШЛА! БУДЗЕ УЗІМКУ АБЕД!





ДЛЯ СОНЯЎ ПАСЛАЦЦА НА ЗІМУ – КЛОПАТ АДКАЗНЫ. КАБ НЕ ЗАСТАЦЦА БЕЗ МЯККАЙ І ЦЁПЛАЙ ПАСЦЕЛІ, ПАД ПНЕМ ЯНЫ ПАЧАЛІ ЛАДАВАЦЬ САБЕ СХОЎ: СЦЯГАЮЦЬ ТУДЫ СУХОЕ ЛІСЦЕ.



ЛЯСНАЯ КУНІЦА СОЧЫЦЬ ЗДАБЫЧУ. ПРЫЦЯРУШАНЫ СНЕГАМ КАМЕЛЬ СЛУЖЫЦЬ ЁЙ ЗРУЧНАЙ ПАЛЯЎНІЧАЙ СЦЯЖЫНАЙ.



Каля пня паваленага дрэва раскінуў першае кволае лісце новы дуб, а ў струхлелай драўніне вывеліся жукі-алені.



НА МЕСЦЫ ПНЯ, А КОЛІСЬ ВЕЛІЧНАГА ДУБА, УЗНЯЎСЯ ЖЫВЫ ПАГОРАЧАК-ПОМНІК: ВЯЛІКІ ПРЫГОЖЫ МУРАШНІК. А ПАРАСТАК-ДУБОК ВЫРАС У СТАЛАЕ ДРЭВА.







## *Наш сябар!*



*Вось і ўсё, што мы хацелі табе расказаць у гэтай гісторыі-маляванцы. Ты закончыў работу і цяпер паспрабуй адказаць на нашы пытанні.*

ЯКІЯ ДРЭВЫ РАСТУЦЬ ЗА ТВАІМ АКНОМ? КОЛЬКІ ІХ, ЯКОГА ЯНЫ ЎЗРОСТУ? ЦІ БАЧЫЎ ТЫ КАЛІ ПАВАЛЕНАЕ ДРЭВА? ХТО ЖЫВЕ НА ДРЭВАХ У ЛЕСЕ? АД ЧАГО ПАДАЮЦЬ ДРЭВЫ? ЯК ЧАЛАВЕК ПАВІНЕН СТАВІЦЦА ДА ПАВАЛЕНАГА ДРЭВА? ЧАМУ ДРЭВА, ЯКОЕ ЎПАЛА, УПАДАБАЛІ ЖЫХАРЫ ЛЕСУ? ЧЫМ ЯНО ПРЫДАЛОСЯ, ХТО ЯК СКАРЫСТАЎСЯ ПАВАЛЕНЫМ ДРЭВАМ? ХТО З ЛЯСНЫХ ГЕРОЯЎ МАЛЯВАНКІ ТАБЕ СПАДАБАЎСЯ НАЙБОЛЬШ? ЯК ТЫ ЗРАЗУМЕЎ СЛОВЫ: "ЗВАЛЕНАЕ ДРЭВА НЕ СТРАЧВАЕ ГОДНАСЦЬ І ХАРАСТВО"? І ЯК ТЫ ДУМАЕШ, ЦІ МАГЛА БЫЦЬ ІНШАЙ ГІСТОРЫЯ ПАВАЛЕНАГА ДРЭВА?

РАСЦІ ВЯЛІКІ! ПАСАДЗІ ДРЭВА.

*Калі ты, наш сябар, любіш прыроду і сам назіраеш цікавыя гісторыі, раскажы нам.*
*Разам зробім маляванку, а табе дастанецца прыз газеты "Белавежская пушча".*
*Расці вялікі! І пасадзі дрэва.*

**Наш адрас: "Белавежская пушча", вул. Іванаўская, 38, 16, Мінск 220088.**
**E-mail: pushcha@irex.minsk.by.**

*Над кніжкай працавалі:*
© *Валеры Дранчук (ідэя, рэдагаванне, тэкст, макет, іншае)*
© *Іна Зеніна (распрацоўка ідэі, укладанне малюнкаў-сюжэтаў, тэкст, кіраўніцтва праектам)*
© *Пятро Арлоўскі (мастацкае ўвасабленне)*

**Творчы калектыў выказвае шчырую падзяку Гомельскаму абласному грамадскаму аб'яднанню “Грамадзянскія ініцыятывы” за чынны ўдзел у ажыццяўленні першага выдання серыі.**